# 2017-ы — ГОД НАВУКІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб абвяшчэнні 2017 года Годам навукі».**

Асноўнай мэтай гэтага рашэння з'яўляецца павышэнне ролі навукі ў выкананні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы, стварэнне спрыяльных умоў для захавання і развіцця навуковага патэнцыялу, фарміраванне міжнароднага іміджу Беларусі як краіны з высокім узроўнем інтэлектуальнага і чалавечага капіталу.

Ураду даручана з удзелам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама распрацаваць і зацвердзіць рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні Года навукі, які адлюстроўвае ўзаемадзеянне навукі з сацыяльнай сферай, галінамі эканомікі, інавацыйную дзейнасць, міжнароднае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

Рэалізацыя плана мерапрыемстваў будзе спрыяць развіццю айчынных навуковых школ, вузаўскай і галіновай навукі для забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту краіны, павелічэнню навуковага патэнцыялу Беларусі, падтрымцы творча думаючых маладых навукоўцаў і спецыялістаў, іх патрыятычнаму выхаванню.

# Ахвярам тэракта

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ «Аб пенсійным забеспячэнні грамадзян, якія пацярпелі ў выніку акта тэрарызму».**

Дакумент накіраваны на ўзмацненне сацыяльнай абароны грамадзян, якім устаноўлена інваліднасць з прычыны цялесных пашкоджанняў, атрыманых непасрэдна ў выніку акта тэрарызму, што адбыўся 11 красавіка 2011 года ў Мінску на станцыі метро «Кастрычніцкая».

Указам устаноўлены асаблівы парадак прызначэння і пераразліку пенсій пацярпелым.

Прызначэнне такіх пенсій будзе ажыццяўляцца зыходзячы з заробку, вылічанага за апошнія 12 месяцаў працы, якія папярэднічалі акту тэрарызму, з улікам паказчыка ступені страты прафесійнай працаздольнасці (замест устаноўленай групы інваліднасці).

Будзе таксама забяспечвацца штомесячны пераразлік названых пенсій у сувязі з ростам у рэспубліцы сярэдняй заработнай платы.

Прыняты Указ дасць магчымасць павялічыць памеры пенсій грамадзянам, якія сталі інвалідамі з прычыны акта тэрарызму.

## Парламенцкі дзённік

# ЗДАРОВАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

## У тым ліку і на шынным рынку

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, наведаў прадпрыемства «Белшына». Падчас візіту спікер заявіў, што першую чаргу мадэрнізацыі завода звышбуйнагабарытных шын (ЗБГШ) плануюць скончыць у студзені наступнага года.**



Фота БЕЛТА.

«Тэхнічнае пераўзбраенне прынесла прадпрыемству адчувальныя вынікі, — заявіў парламентарый. — Таварыства паляпшае якасныя і колькасныя паказчыкі сваёй працы. Так, за студзень-кастрычнік бягучага года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2015-га выручка павялічылася на 25%, адзначаецца рост экспарту — дзве трэція выраблена́й прадукцыі рэалізуюцца за межамі Беларусі».

Па словах сенатара, пакуль ёсць нараканні па якасці прадукцыі з боку Міністэрства прамысловасці, а таксама сельскай гаспадаркі. Але, на думку Міхаіла Мясніковіча, у гэтым «ніякіх непераадольных пытанняў няма», і ў «Белшыны» ёсць добрая перспектыва.

Пры гэтым мадэрнізацыя на «Белшыне» праведзена своечасова і мусіць прыўнесці эканамічны эфект, а тэрмін акупнасці ў 10—12 год — норма для такой вялікай вытворчасці. Структура інвестыцыйнага капіталу напружаная, але небезнадзейная. «Таму я лічу, што спяшацца з другой чаргой мадэрнізацыі завода пакуль не варта, трэба досыць добра адпрацаваць тэхналогію па першай. Тут плануецца выпрабляць больш за 1,1 тысячы звышбуйнагабарытных шын. Такім чынам, можна будзе «абуваць» усе нашы «БелАЗы» вялікай грузапад'ёмнасці, а таксама экспартаваць прадукцыю», — адзначыў спікер верхняй палаты беларускага парламента.

Калі вывесці завод ЗБГШ на запланаваныя праектныя магутнасці, можна будзе гаварыць аб высокай канкурэнтаздольнасці «Белшыны» на рынку, росце выручкі, рэнтабельнасці рэалізуемай прадукцыі і эфектыўнай працы прадпрыемства ў цэлым. Пры гэтым, па словах парламентарыя, прадпрыемства нясе страты з-за нездаровай канкурэнцыі з боку расійскіх вытворцаў. Так, адзначаецца рост імпарту шын, аналагі якіх маюцца ў айчыннай кампаніі. Больш нізкія цэны на расійскія звязаны з «рашэннямі па энерганосьбітах і па сыравіне для сваіх (расійскіх. — «**Зв.**») прадпрыемстваў шыннай прамысловасці па цэнах ніжэй, чым для беларускіх пакупнікоў», што стварае няроўныя ўмовы на агульным рынку. «Па шмат якіх іншых паказчыках мы не назіраемся ў межах фарміравання адзінай эканамічнай прасторы без выдаткаў і абмежаванняў, а разыходзімся. На жаль, гэта імкненне выжыць у цяжкі час у адзіночку, я лічу, з'яўляецца памылковым», — падкрэсліў сенатар.

Цяпер разам з урадам абмяркоўваюцца новыя падыходы працы ў Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі і Еўразійскім эканамічным саюзе для таго, каб разам праводзіць узгодненую эканамічную палітыку. Пры гэтым спікер дапускае «меры дзяржаўнага пратэкцыянізму», але яны павінны быць узгоднены і не шкодзіць партнёрам па агульнай эканамічнай прасторы. «Зразумела, канкурэнцыя павінна быць, але яна мусіць быць здаровай», — лічыць Міхаіл Мясніковіч.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zvizda.by*

## Нашы дзеці

# Ратаўнікі завіталі ў Чахаўшчыну

**Акцыя «Нашы дзеці» працягвае крочыць па краіне. Не засталіся ўбаку ад яе і ратаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Ужо па сталай традыцыі яны накіраваліся ў падшэфную дапаможную школу-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Знаходзіцца яна ў невялікай вёсцы Чахаўшчына на Валожыншчыне.**

Раней ратаўнікі набылі для школы камп'ютары, дапамаглі адрамантаваць будынак інтэрната, абсталявалі спартыўную залу. А ўчора **міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА** перадаў навучальнай установе тэлевізар.

— Нават калі б акцыя «Нашы дзеці» не аб'яўлялася афіцыйна, яна ўсё роўна адбылася б. Бо яна дапамагае вырашаць важныя пытанні, з якімі сутыкаюцца маленькія жыхары краіны, — зазначыў Уладзімір Вашчанка.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# «Таблетка» радасці

**У межах рэспубліканскай дабрачыннай акцыі не засталіся па-за ўвагай дзяржаўных структур і пацыенты 3-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы.**

**Старшыня Следчага камітэта, генерал-маёр юстыцыі Іван НАСКЕВІЧ** асабіста павіншаваў дзяцей з надыходзячымі святамі, пажадаў ім хуткага выздараўлення. У сваю чаргу кіраўнік ведамства ўручыў маленькім пацыентам найлепшую для іх «таблетку» — падарункі, а таксама паўдзельнічаў у святочным прадстаўленні.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

## Векапомнае

# УЗНАГАРОДА ЗНАЙШЛА СВАЙГО ГЕРОЯ

## Ордэн Чырвонай Зоркі праз шмат гадоў вярнуўся ў сям'ю ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны

**Мінулай вясной высокую салдацкую ўзнагароду ў ваенны камісарыят Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў прынёс мясцовы жыхар, які пажадаў застацца невядомым. Паўтара года пошуку далёка не прывялі — уладальнік ордэна, а дакладней, яго сваякі жывуць на Бабруйшчыне.**



Фота Аляксандра АНТАШКЕВІЧА.

Ваенны камісар Аляксей БЕРАЗОЎСКІ ўручае дзецям старшага сяржанта Станіслава ДЫЛЕВІЧА бацькаў ордэн.

Старшага сяржанта Станіслава Дылевіча, якому належала ўзнагарода, ужо даўно няма на гэтым свеце. Большасць свайго жыцця ён правёў у знакамітым пасёлку Глуша, што каля Бабруйска. Яго дзеці, Уладзімір і Валянціна, памятаюць бацькаву пяціканцовую зорачку, але калі і, самае галоўнае, куды яна знікла, прыгадаць не могуць.

— Магчыма, ордэн забралі падчас аднаго з крадзяжоў у бацькоўскай хаце, — мяркуе Валянціна Станіславаўна.

Не заўважыць прапажу дзеці маглі вельмі проста: усе астатнія ўзнагароды былі на месцы. Пра тое, якой цаной быў здабыты ордэн, яны не ведалі. Таму і не надавалі яму асаблівай увагі. Бацька ніколі пра вайну не расказваў. Нашчадкі ведалі толькі, што у вайну той быў параненым, двойчы здолеў уцячы з нямецкага палону. Больш — нічога.

Пра тое, што іх бацька — кавалер ордэна Чырвонай Зоркі, нашчадкі ветэрана ўпершыню пачулі на днях. А менавіта калі ў ваенным камісарыяце Бабруйска, Бабруйскага, Глускага і Кіраўскага раёнаў ім уручылі ўзнагароду, узнагародны ліст, а таксама копію загада аб прысваенні ордэна. Вось што там напісана: «Ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць узнагароджваецца ордэнам Чырвонай Зоркі старшы сяржант Дылевіч Станіслаў Станіслававіч». Было гэта ў чэрвені 1944 года.

Але да гэтай урачыстасці ў лёсе чырвонаармейца было яшчэ шмат падзей. На фронт ён, ураджэнец Харкаўскай вобласці, пайшоў 25-гадовым хлопцам. Змагаўся ў жорсткіх баях з нямецка-фашысцкімі акупантамі за Нікопаль, Ржэў, Веліж, Віцебск. Удзельнічаў у танкавым дэсанце на вёску Рыбакі, што каля Янавічаў, у выніку чаго яна была вызвалена. Са свайго аўтамата старшы сяржант знішчыў каля дзесяці гітлераўцаў. І сам атрымаў варожую кулю. На шчасце, не смяротную. Будучы параненым, ён, колькі мог, страляў па немцах. Поле бою пакінуў толькі тады, калі савецкія салдаты ўпэўнена замацаваліся на пазіцыях. Хутчэй за ўсё, менавіта за гэты бой на гімнасцёрцы Станіслава Дылевіча неўзабаве заззяў ордэн.

Па шматлікіх падзяках, якія захоўваюцца ў сямейным архіве, унук чырвонаармейца, Дзмітрый Дылевіч, прасачыў, што яго дзед прайшоў шлях ад Смаленска да Берліна. Ён, сёння падпалкоўнік, свайго дзеда не памятае, ды і бацькі шмат не расказвалі. Таму цікавіўся яго ваеннай біяграфіяй праз сучасныя электронныя банкі дакументаў. Але і тыя маўчалі...

Аказалася, што ў дакументах, у тым жа ўзнагародным лісце, няправільна напісана прозвішча салдата — замест Дылевіч, той стаў Дзілевічам. Гэта частая памылка таго часу, калі дакументы складаліся ва ўмовах фронту, а калі і падчас баявых дзеянняў.

...Яшчэ адна ўзнагарода ў той дзень трапіла ў добрыя рукі. Праўда, каму належаў медаль «Партызану Айчыннай вайны І ступені», высветліць так і не ўдалося. Як расказала вядучы спецыяліст па сацыяльнай абароне і пенсійным забеспячэнні ваеннага камісарыята Вольга Бакіцько, узнагароду ў ваенкамат прынеслі спецыялісты адной з будаўнічых арганізацый, якія таксама пажадалі застацца інкогніта. Вядома толькі, што знайшлі ўзнагароду падчас зносу старой хаты. Цікава, што ляжала яна ў адной каробачцы з палавінкай нямецкага жэтона.

У ваенкамаце гэта не першы падобны выпадак, калі не ўдалося знайсці гаспадара ўзнагароды. Таму пытання, куды яго перадаць на захоўванне, не ўзнікла. У бабруйскай сярэдняй школе № 17 створана экспазіцыя баявой славы, якая неўзабаве можа ператварыцца ў школьны музей. Там ужо захоўваецца «безыменны» ордэн Чырвонай Зоркі...

— Захоўваць такія каштоўныя сведчанні мінулай вайны — гонар для нашай школы, — лічыць дырэктар бабруйскай сярэдняй школы № 17 Вераніка Еўдакімава. — У тым ліку дзякуючы ім, дзеці хутчэй пранікаюцца тымі жудаснымі падзеямі, якія выпалі на лёс беларускага народа.

Можна толькі меркаваць, каму быў уручаны гэты медаль «Партызану Айчыннай вайны І ступені». Магчыма, яго насіў камандзір партызанскага атрада, бо першая ступень мела на ўвазе не толькі праяўленую адвагу ў тыле ворага, а і асаблівыя заслугі ў арганізацыі партызанскага руху. Такім медалём было ўзнагароджана 56 883 чалавекі.

— За апошнія два гады ваенным камісарыятам на тэрыторыі Бабруйска і Бабруйскага раёна былі знойдзены 8 узнагарод часоў Вялікай Айчыннай вайны, — расказаў **ваенны камісар, падпалкоўнік Аляксей БЕРАЗОЎСКІ.** — Не ўдалося ўстанавіць прыналежнасць толькі дзвюх узнагарод. Астатнія былі ўручаны нашчадкам удзельнікаў вайны, якія цяпер жывуць у Кіраўскім, Бабруйскім і Пухавіцкім раёнах, нават у Геленджыку, адна экспануецца ў школьным музеі Глуска.

Як прызналіся сваякі старшага сяржанта Дылевіча, у чыім доме будзе захоўвацца бацькава ўзнагарода, якая зноў вярнулася ў сям'ю, яны пакуль не ведаюць. Але адназначна ўсе тыя артэфакты, якія яны атрымалі ад ваенкамата, зоймуць пачэснае месца, якое будзе нагадваць ім аб гераічным продку. Такім свайго бацьку і дзеда яны да нядаўняга часу не ведалі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

*г. Бабруйск*